Ніна Борсук (Брэст)

# ГІСТОРЫЯ ГОРАДА БРЭСТ-ЛІТОЎСКА КАНЦА ХІХ-ПАЧ. ХХ СТСТ. (ПА МАТЭРЫЯЛАХ ПЕРШАГА КАЛЕНДАРА-ДАВЕДНІКА Г. БРЭСТ-ЛІТОЎСКА 1912 Г.)

Першы каляндар-даведнік г. Брэст-Літоўска ўбачыў свет у 1912 годзе. Да напісання яго выдавец Я. Хмілеўскі прыступіў невыпадкова. Ім кіравала жаданне "издать въ компактной формѣ изложеніе особенностей сего города, его жизненныхъ условій, наименованіе и адреса нужныхъ для деловых сношеній: лицъ, фирмъ, заведеній и учрежденій, словомъ – дать такого рода сборникъ мѣстныхъ свѣдѣній" [1, с. 5]. Безумоўна, такі дакумент карысна і цікава было б мецъ жыхарам кожнага горада. Невыпадкова Я. Хмілеўскі марыў, каб такога роду выданні з'яўляліся штогод дапоўненымі і выпраўленымі. І як вынік – у 1913 годзе быў выдадзены другі каляндар-даведнік г. Брэст-Літоўска. Аб каштоўнасці выдання (па паўнаце і арыгінальнасці ўключаных звестак) сведчыць увага, з якой аднесліся да працы Я. Хмілеўскага буйныя гандлёва-прамысловыя фірмы, што змясцілі аб'явы на старонках календара ў рэкламным аддзеле.

З матэрыялаў выдання чытач можа даведацца, што ў горадзе, без уліку вайскоўцаў, у 1897 годзе налічвалася каля 46565 чалавек. Да 1911 года гэтая лічба павялічылася да 53253. Сярод жыхароў г. Брэст-Літоўска выдзялялася значная колькасць рускіх (праваслаўных) – 9641 ч., палякаў (католікаў) – 6737 ч., яўрэяў (іудзеяў) – 36537 ч., немцаў (лютэранцаў) – 220 ч., французаў (католікаў) – 68 ч., турак і татар (магаметан) – 44 ч., армян (армяна-грыгарыян) – 5 ч. Як бачна, пануючую частку насельніцтва складалі яўрэі. Наяўнасць двух манастыроў, 10 праваслаўных цэркваў, некалькіх рымска-каталіцкіх кляштароў, Дамініканскага і Фарнага касцёлаў, яўрэйскай сінагогі сведчыць аб рэлігійнай цярпімасці, павазе людзей адной веры да другой.

Дарэчы, складаная назва горада Брэст-Літоўск не прыйшлася даспадобы значнай колькасці палескіх сялян. Ім па-ранейшаму імпанавала "Берестье" (пад такою назваю горад упершыню ўзгадваецца ў старажытных актах 1016 года). Нягледзячы на гэта, Я. Хмілеўскі не падтрымлівае ініцыятараў задумы афіцыйнага перайменавання "Брестъ-Литовска" ў былое "Берестье". Выдавец лічыць гэтую справу бескарыснай.

Па-за ўвагай выдаўца не застаўся і той факт, што на тэрыторыі краю не адбылося ніводнай значнай гістарычнай падзеі, якая б мела мясцовы характар і заслугоўвала ўважлівага да яе стаўлення. Я. Хмілеўскі на старонках календара ўзгадвае пажарныя бедствы, якія на працягу аднаго дзесяцігоддзя двойчы паражылі жыхары горада. Першы пажар, што адбыўся ў 1895 годзе, суправаджаўся чалавечымі ахвярамі. Была знішчана амаль палова горада. Шчырасць, спагадлівасць, узаемадапамогу праявіла як насельніцтва г. Брэст-Літоўска, так і іх суседзі. Ахвяраванні, што, па трапнай заўвазе Я. Хмілеўскага, "сыпались как изъ рога изобилія», выратавалі і дапамаглі стаць на ногі няшчасным пагарэльцам. Неабходна адзначыць: да гэтага пажару людзі не надавалі належнай увагі страхаванню маёмасці. Бедната глядзела на гэта як на блазенства. Толькі пасля няшчасця людзі ўсвядомілі неабходнасць страхавання сваёй маёмасці і, як звычайна бывае ў такіх выпадках, сталі залішне шчыраваць, іншымі словамі, страхавалі маёмасць вышэй за кошт.

Я. Хмілеўскі выказвае цікавую гіпотэзу: быццам другі пажар 1901 года ўзнік невыпадкова, а як следства празмерных страховак. Падчас пажару была знішчана цэнтральная частка горада, але, па перакананні выдаўца, менавіта пасля гэтага няшчасця назіраюцца станоўчыя змены ў знешнім вобліку горада. Я. Хмілеўскага не здзіўляе і той факт, што менавіта ў гэты перыяд умацавалася матэрыяльнае становішча асобных гараджан.

Згодна плана, што быў прадстаўлены ў 1911 годзе на Найвышэйшае зацвярджэнне, горад займаў плошчу ў 505 дзесяцін 1737 кв. сажаняў. Ён быў падзелены на 103 кварталы, што мелі выгляд правільных чатырохвугольнікаў. У межах горада налічвалася каля 36 вуліц і завулкаў, тры вялікія бульвары і сквер. Уздоўж тратуараў (усіх без выключэння вуліц) былі пасаджаны дэкаратыўныя дрэвы. Згодна рашэнню гарадскіх улад (праект быў разлічаны на бліжэйшае дзесяцігоддзе) вуліцы пачалі брукаваць часткова каменем, а часткова пліткай. Дарэчы, пачынаючы з 1912 года, на ажыццяўленне дадзенага праекта пералічваліся грошы, якія спаганяліся з грузаабароту.

На старонках выдання не раз прыводзяцца лічбы, якія не пакідаюць чытача абыякавым. Напрыклад, на 1912 год у Брэст-Літоўску налічвалася 2337 дамоў: з іх – 982 каменных, 1263 драўляных і 92 змешанага тыпу; страха 2/ 3 будынкаў крыта жалезам, іншых – толем альбо гонтамі і толькі чатырох – чарапіцай; пераважная колькасць двухпавярховых каменных дамоў стыльнай архітэктуры вырасла менавіта пасля пажару. Па назіраннях Я. Хмілеўскага, недахопу ў кватэрах у межах горада не адчувалася. Больш за тое, ён звяртае ўвагу чытача на лішкі жылля "вслѣдствіе усиленной за послѣдніе годы застройки, превышающей дѣйствительную потребность" [1, с. 42]. Нягледзячы на гэта, кошт кватэр у Брэст-Літоўску быў у тыя часы даволі высокі: трохпакаёвая кватэра каштавала 360-400 руб. у год з аплатаю за паўгода наперад; асобныя пакоі можна было знайсці ад двух рублёў за месяц. Як ні дзіўна, але цэны на жыллё ў гандлёвай частцы горада і блізка ад навучальных устаноў наблізіліся да цэн Варшавы, Вільні і іншых значных цэнтраў.

Бясспрэчна, жыццё ў горадзе, як сведчаць матэрыялы першага календарадаведніка г. Брэст-Літоўска, было даволі дарагім. Па гэтай прычыне мясцовае насельніцтва адчувала патрэбу ў крэдытаванні: "Цѣлый рядъ открытыхъ кредитныхъ учрежденій, сильно развивающихся – наглядное доказательство потребности въ кредитѣ. Жаль только, что несовершенныя условія организаціи и веденія дѣла вынуждаютъ всѣ наши общественныя, даже мелкія кредитныя учрежденія, брать ещё сравнительно высокіе проценты по учёту, значительно превышающіе тотъ размѣръ процентовъ, какой взимаютъ со своихъ кліентовъ акціонерные банки" [1, с. 59]. Гэтую праблему востра адчувалі і гарадскія ўлады. Невыпадкова на адным з пасяджэнняў Гарадской Думы, паведамляе Я. Хмілеўскі, было разгледжана пытанне аб адкрыцці Гарадскога ламбарда і аддзялення Дзяржаўнага банка. Як тут не ўзгадаць першую крэдытную ўстанову ў горадзе – Банкірскую кантору Салавейчыка і Моргенштэрна.

З працы Я. Хмілеўскага мы даведаліся, што з 1907 года ў горадзе была наладжана тэлефонная сувязь. Ёю з задавальненнем карысталася 180 жыхароў горада. Параўнальна абмежаваная колькасць абанентаў тлумачыцца, з пункту погляду выдаўца, высокай платай за тэлефон – 60 рублёў. Для дастаўкі страхавой карэспандэнцыі курсіравалі спецыяльныя паштовыя карэты, функцыі разносчыкаў выконвалі дванаццаць чалавек. Для простай карэспандэнцыі па гораду было

ўстаноўлена 18 скрынак, з якіх лісты выбіралі тры разы ў суткі (а 16 гадзіне, 17 гадзіне, 4 гадзіне ночы). Бясспрэчна, уражваюць наступныя лічбы: усяго за год была адпраўлена і атрымана тэлеграм – 92000; заказных лістоў –201800 (па гарадской канторы) + 40000 (па чыгуначнаму паштоваму аддзяленню); простай карэспандэнцыі – 7000000 + 250000; страхавой – 130298 + 17519.

На думку Я. Хмілеўскага, Брэст-Літоўск у адносінах да чыгуначных і шасэйных дарог знаходзіўся ў выключна спрыяльных умовах, якім мог бы пазайздросціць любы горад. Цэнтральны пасажырскі вакзал, што быў пабудаваны ў 1886 годзе, па прыгажосці і зручнасці лічыўся ў Расіі адзіным у сваім родзе: праз Брэст хадзілі беспярасадачныя цягнікі "Парыж-Уладзівасток", "Масква-Варшава-Граніца", "Каліш-Варшава-Кіеў-Растоў-на-Доне"; паштовыя "Масква-Варшава" і "Адэса-Беласток-Граева". Выдавец звяртае ўвагу, што для зручнасці пасажыраў усе цягнікі, акрамя "Масква-Варшава", прыбывалі зранку альбо ўвечары, і прамежак часу паміж перасадкамі займаў не больш за тры-чатыры гадзіны. Неабходна адзначыць, што ўсе шасэйныя дарогі ішлі паралельна чыгуначным, напрыклад, на Варшаву, Маскву, Кіеў, Холм.

Для ажыццяўлення грузавога руху было задзейнічана пяць станцый: Брэст Таварны; Брэст-Мухавец, спецыяльная станцыя для выгрузкі лясных матэрыялаў; ваенная рампа для цытадэльных грузаў. Што да водных шляхоў зносін, то імі можна было карыстацца па прычыне мелкаводнасці выключна з мэтаю сплаву лясных матэрыялаў за мяжу (Данцыг, Торн). Я. Хмілеўскі выказвае занепакоенасць тым, што адчуваецца патрэба ў цягніках мясцовых прыгарадных шляхоў зносін, асабліва на дачны перыяд (гл. раздзел "Пути сообщенія").

Пазнаёміўшыся з працаю Я. Хмілеўскага, мы пераканаліся, што Брэст-Літоўск быў вядомы перш-наперш як горад гандляроў. Некаторыя віды саматужнага промыслу, а таксама апрацоўчая прамысловасць (апрацоўчая прамысловасць была прадстаўлена гільзавай, макароннай, канвертнай фабрыкамі, гарбарным, свечачным заводамі) займалі другое месца пасля гандлю: гадавы даход па гандлю складаў 9700000, а па прамысловасці – 300000 рублёў. Узнікае пытанне: чаму значнага росквіту дасягнула капялюшная справа, вытворчасць абутку, бондарная, колавая і тачачная справы (рэчы мясцовых майстроў нават экспартавалі ў многія гарады Еўропы і Сярэдняй Азіі), а не прамысловасць? На думку Я. Хмілеўскага, у горадзе не магла належным чынам развівацца прамысловасць, бо ён знаходзіўся ў рэгіёне першакласнай крэпасці, дзе згодна з эспланаднымі правіламі забараняліся высокія будынкі і выцяжныя коміны. Нязначная колькасць мясцовых жыхароў займалася земляробствам, а яшчэ меншая – рыбалоўствам. Яўрэйскае насельніцтва аддавала перавагу возніцтву (вадавознаму, грузавому, легкавому). Акрамя таго, наш горад славіўся каўбаснымі і кандытарскімі вырабамі (гл. раздзел "Занятіе жителей").

Я. Хмілеўскі занепакоены затратамі гарадскіх улад на ўтрыманне арміі, паліцыі, бо на гэтую сферу дзейнасці выдзяляліся сродкаў у пяць і дзесяць разоў болей, чым адпаведна на развіццё народнай адукацыі медыцыны. Хвалюецца выдавец і па той прычыне, што з кожным годам гарадскі бюджэт значна змяншаецца: у 1909 годзе ён складаў 253193 р. 96 кап., у 1910 годзе – 233428 р. 78 кап., у 1911 годзе – 219069 р. 62 кап.

Пад час выхаду Першага календара-даведніка г. Брэст-Літоўска 1912 года горад уяўляў сабой значны культурны цэнтр, асабліва, калі параўнаць яго па колькасці навучальных устаноў з суседнімі павятовымі і нават некаторымі

губернскімі гарадамі, а таксама ў параўнанні з яго мінулым (гл. раздзел "Учебная часть"). На 1911/12 навучальны год налічвалася каля 9 ½ тысяч дзяцей школьнага ўзросту.

Навучэнцы мелі магчымасць карыстацца кнігамі з бібліятэк-чытальняў, якія знаходзіліся пры гарадскіх, ваенных і пажарных сходах. На дом выдавалі кнігі дзве прыватныя бібліятэкі. За карыстанне адной кнігай навучэнцы плацілі ў месяц 30 кап. Я. Хмілеўскі паведамляе, што з нагоды 100-гадавіны з дня нараджэння М.В. Гогаля будзе адкрыта Гарадская Публічная Бібліятэка-Чытальня.

Радуе, што горад Брэст-Літоўск, як і сучасны горад Брэст, вылучаўся чыстатой і парадкам. За гэтым строга сачыла спецыяльна створаная Гарадская Санітарная Камісія; час і спосабы ачысткі горада рэгуляваліся спецыяльнымі пастановамі. Дзякуючы намаганням Таварыства апекавання жывёламі, з 1911 года функцыянавала ветэрынарная амбулаторыя. Жыхары Брэст-Літоўска маглі прайсці курс лячэння ў гарадской бальніцы, якая была разлічана на 40 ложкаў, яўрэйскай (на 48 ложкаў), чыгуначнай (на 52 ложкі), прыватнай хірургічнай лячэбніцы Шырокава і Дзбаноўскага (на 4 ложкі), вочнай лячэбніцы Карпінскага, вайсковым шпіталі. У горадзе дзейнічала 20 вольна-практыкуемых урачоў, фельчараў – 10, акушэрак – 13, ветурачоў – 4, стаматолагаў – 11, працавала 11 аптэк. Адчувалася патрэба ў аддзяленні дзіцячай лячэбніцы. З эпідэмічных захворванняў зарэгістраваны тыф і шкарлятына. Нягледзячы на гэта, Я. Хмілеўскі станоўча ацэньвае ў раздзеле "Медицинская и санитарная части" працу медыцынскіх работнікаў горада Брэст-Літоўска.

Не засталася па-за ўвагай выдаўца справа дабрачыннасці (гл. раздзел "Общественная благотворительность"). Я. Хмілеўскі грунтоўна азнаёміўся з працаю суда і адвакатуры (раздзел "Судъ і адвокатура").

Як бачна, Першы каляндар-даведнік г. Брэст-Літоўска 1912 года, які ўбачыў свет у прыватнай тыпаграфіі І. Кобрынца г. Брэст-Літоўска, – гэта важны гістарычны дакумент, які дапамагае нам уявіць роднае Берасце на пачатку XX стст. Заслуга Я. Хмілеўскага заключаецца не толькі ў тым, што ён здолеў сабраць арыгінальны, свежы матэрыял, апрацаваць яго, сістэматызаваць па адпаведных раздзелах за адносна кароткі тэрмін ("Историческій справочникъ", "Населеніе", "Условія жизни", «Почта, телеграфъ и телефонъ» і г.д.), але і ў тым, што выдавец здолеў аформіць і выдаць каляндар-даведнік у адпаведнасці з усімі патрабаваннямі, што прад'яўляюцца да гэтай літаратурнай формы. Невыпадкова вышэйназваны дакумент належыць да ліку нямногіх вядомых на сённяшні дзень даведнікаў правінцыйных гарадоў.

**Літаратура**

1. Хмилевскій, Я. Первый календарь-справочник г. Брэст-Литовска / Я. Хмилевскій. – Брестъ-Литовскъ, 1912.